Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# ПРАСЦЕЙ, ЧЫМ БАНСАЙ:
## расліны з незвычайнымі сцёбламі

Фарміраванне сцябла — гэта магчымасцьператварыць класічную расліну ў эксклюзіўны экзэмпляр. Ёсць і такія культуры, якія не патрабуюць фарміроўкі

**Бансай — гэта мастацтва вырошчвання дрэў у мініяцюры. Завесці такія незвычайныя расліны ў сябе дома, без сумнення, мараць многія. Але каштуе бансай нятанна, самім вырасціць яго складана, ды і догляд такому «карліку» патрэбен асаблівы. Зусім іншая справа, калі «ператварыць» у дрэва, напрыклад, звычайны фікус Бенджаміна. Ёсць і іншы варыянт — завесці экзоты — і ніякай фарміроўкі не спатрэбіцца.**

### Фікус на штамбе

Фікус Бенджаміна — расліна, якая выдатна падыходзіць для фарміроўкі адзіночнага ствала. У яго падатлівыя парасткі, з якіх лёгка сфарміраваць зялёную «шапку». Да таго ж культура вельмі непераборлівая і хутка расце. Для большага эфекту ствалу фікуса можна надаць форму спіралькі.



Вельмі арыгінальна глядзіцца ствол у выглядзе «коскі». Яе можна «сплесці», калі ў адзін гаршчок высадзіць адразу тры маладыя фікусы. У такім узросце іх гнуткія ствалы лёгка гнуцца і не ламаюцца.

Калі ў вас шмат чаранкоў расліны, можна высадзіць іх па крузе на аднолькавай адлегласці адзін ад аднаго і па меры росту сфарміраваць з іх рашотку. Атрымаецца полы ўнутры сеткаваты ствол. Увянчае «збудаванне» капа зеляніны.

### Пакаёвы бамбук

Гэту расліну часта называюць бамбукам, хоць на самай справе гэта драцэна Сандэра. Яна непатрабавальная, можа расці як у зямлі, так і ў вадзе. Як і ў выпадку з фікусам, з некалькіх асобнікаў гэтай драцэны можна «сплесці» адну расліну з рашэцістым сцяблом.

Наогул, гэта вельмі падатлівая расліна, з якой можна «скруціць» усё, што пажадаеце. Нават «ялінкі».



Драцэна Сандэра добрая і з абсалютна прамымі ствалікамі. Проста звяжыце некалькі такіх «бамбукаў» у пучок, і атрымаеце «дрэва» з тоўстым ствалом і зялёнай кронай.

### Фарміроўка кроны ў таўсцянкі

Прыняць форму міні-дрэўца можа і таўсцянка. Грашовае дрэва — даволі папулярная расліна. Многія вераць, што знаходжанне гаршчэчка з гэтай культурай у кватэры абавязкова абяцае багацце. Наколькі гэта справядліва, ніхто не ведае. Але калі ўжо вы завялі таўсцянку, надайце ёй такі выгляд, каб яна прыцягвала да сябе ўвагу.



Незвычайнасці псеўдабансай можна дадаць, калі выбраць які-небудзь нестандартны выгляд расліны.

### Адэніум — бансай для лянівых

Адэніум уяўляе сабой кусцік, які вельмі павольна расце, ці невялікае дрэўца з буйным мясістым ствалом. Патаўшчэнне ў ніжняй частцы ствала называецца каўдэксам, большая частка якога можа знаходзіцца пад зямлёй.

Паходзіць культура з засушлівых краін, там ёй якраз і патрэбна такое патоўшчанае сцябло — у ім назапашваецца вада і пажыўныя рэчывы. Такога кветкавага «вярблюда» яшчэ называюць ружай пустыні, таму што расліна вельмі прыгожа і багата цвіце. У перыяд распускання бутонаў адэніум выглядае непаўторна. Афарбоўка кветак можа вар'іравацца ад белай да цёмна-малінавай. Вырасціць адэніум у свойскім кветніку зусім не складана.



### Міні-дрэва з налінаў

Яшчэ адна культура з патоўшчаным сцяблом — гэта налін (або бутэлькавае дрэва). У прыродзе гэта расліна вырастае вельмі высокай, а ў выглядзе пакаёвай культуры ўяўляе сабой дрэўца ў мініяцюры.

Маладая расліна вельмі падобная на цыбулю: з зямлі выступае цыбуліна, з якой расце «вадаспад» зеляніны. Па меры росту ствол расліны паступова выцягваецца, і налін становіцца падобным на дрэўца.



## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.02 | 16.54 | 7.52 |
| Віцебск — | 8.58 | 16.36 | 7.38 |
| Магілёў — | 8.52 | 16.43 | 7.51 |
| Гомель — | 8.41 | 16.48 | 8.07 |
| Гродна — | 9.16 | 17.10 | 7.54 |
| Брэст — | 9.09 | 17.18 | 8.09 |

### Месяц

*Першая квадра 26 лістапада.*
*Месяц у сузор'і Авена.*

### Імяніны

***Пр.*** *Васіля, Віктара, Івана, Мацвея, Мікалая, Міхаіла, Сцяпана, Фёдара.*
***К.*** *Дар'і, Маргарыты, Блажэя, Сатурніна, Сцяпана, Фрэдэрыка.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

### 29 ЛІСТАПАДА

**1817** год — створана таемнае студэнцкае таварыства філаматаў (аматары навукі, ведаў) у Віленскім універсітэце. Існавала да 1823 года.

**1830** год — у Беларусі, Польшчы і Літве пачалося паўстанне супраць царскай Расіі за аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 года. 30 лістапада паўстанцы авалодалі Варшавай. Расійскія войскі вымушаны былі адступіць з Варшавы, а пазней і з тэрыторыі ўсёй Польшчы. Значная частка іх сканцэнтравалася ў Беларусі. У Варшаве быў сфарміраваны Часовы ўрад. У студзені—лютым 1831 года ў Беларусі і Літве быў створаны падпольны Віленскі цэнтральны паўстанцкі камітэт. А ўжо ў сакавіку—красавіку паўстанне ахапіла Ашмянскі, Браслаўскі, Віленскі, Дзісненскі паветы, у кожным з іх стваралiся органы ўлады, якія праводзілі рэкрукі набор у войска. Да канца мая 1831 года ў Віленскай і Мінскай губернях паўстанне было задушана, але працягвалася ў Гродзенскай губерні, што перашкаджала расійскім войскам наступаць на Польшчу. У чэрвені—ліпені 1831 года паўстанцкія ачагі разгараліся ў Пінскім, Мазырскім, Рэчыцкім, Навагрудскім паветах, а таксама на тэрыторыі Магілёўскай і Віцебскай губерняў. У жніўні 1831-га паўстанне ў Беларусі і Літве пацярпела паражэнне, хоць асобныя атрады дзейнічалі і ў верасні.



**1857** год — нарадзіўся (Віцебская губерня) Аляксандр Уладзіміравіч Жыркевіч, пісьменнік, ваенны юрыст, калекцыянер. У 1888 годзе скончыў Пецярбургскую ваенна-юрыдычную акадэмію. Служыў у Віленскім ваенна-акруговым судзе. З 1908 года — генерал-маёр і ваенны суддзя. У знак пратэсту супраць увядзення смяротнага прысуду для палітычных зняволеных у лістападзе 1908 года падаў у адстаўку. Пісаў апавяданні і вершы, якія публікаваў у часопісе «Вестник Европы» і іншых выданнях. Калекцыяніраваў творы расійскіх і замежных мастакоў, якія ў 1922 годзе перадаў у музей Сімбірска. Архіў Жыркевіча (8,5 тысяч старонак дзённіка, амаль 5 тысяч лістоў і фотаздымкаў) захоўваецца ў музеі Л. Талстога ў Маскве. Памёр у 1927 годзе.

**1947** год — нарадзілася (в. Лясец Калінкавіцкага раёна) Соф'я Шах, беларуская паэтэса. Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1990 года. Аўтар паэтычных кніг «І не пакіне спадзяванне», «Пад высокай лагодай нябёс», «Наш двор», «Ад імгнення — да стагоддзя» і іншых.

**1947** год — на II сесіі Генеральнай асамблеі ААН была прынятая рэзалюцыя аб падзеле Палесціны на арабскую і яўрэйскую дзяржавы і выдзяленні горада Іерусаліма ў самастойную адміністрацыйную адзінку.

Было сказана

**Ніна МАЦЯШ, паэтэса:**
*«І перамог няма без паражэння,*
*Без неспакою цішы не знайсці».*

## УСМІХНЕМСЯ

На думку людаеда, камп'ютар ніколі не зможа замяніць чалавека.

**— Можаце ў двух словах ахарактарызаваць вашага жаніха?**
**— Затое не п'е.**

Сын прафесара філалогіі і заслужанай настаўніцы па беларускай мове ўтрымліваў Дзядулю Мароза на працягу трох гадзін, расказваючы яму вершы.

**— Доктар, жыццё стала нейкае шэрае, аднастайнае, нясмачнае. Карацей, страціла ўсякі сэнс.**
**— Ну, галубок, вось тут у мяне віскі, вось тут ром, тэкіла ёсць. З лаймам.**
**— Добры вы псіхолаг, душэўны. Я да вас яшчэ прыйду.**

У банку:
— Якую суму вы хочаце ўзяць у крэдыт?
— 100 тысяч рублёў.
— Якія гарантыі можаце даць?
— Ведаеце... У дзяцінстве я заўсёды вяртаў рэшту бацькам.




Малюнак Паўла ГАРАДЗЦОВА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4424.
Нумар падпісаны ў 19.30 28 лістапада 2017 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12